Рыгор Барадулін

# НАВОШТА

Мінск
2009

Барадулін, Р.І.
Б24 Навошта: вершасказы / Рыгор Барадулін; уклад. Алесь Камоцкі; фотамаст. Джон Кунстадтэр. — Мінск. 2009. — 162 с.: фат.

Кніга вершасказаў Рыгора Барадуліна, аздобленая фотаздымкамі Джона Кунстадтэра.

© Камоцкі А.В., 2009
© Кунстадтэр Дж., фота, 2009

# НАВОШТА

вершасказы,
выказаныя Рыгорам Барадуліным,
спарадкаваныя Алесем Камоцкім,
у атачэньні фотаздымкаў
Джона Кунстадтэра

Хай будзе ўсё як будзе —
Рака цячэ ў вякі.
Хай вейкі асакі
Дрыжаць у перапудзе.

Хай людзіцца бязьлюдзьдзе,
І ў раніцы з рукі
Расу п'юць жаўрукі.
Хай будзе ўсё як будзе...





* * *

Думкі свой узрост не заўважаюць.

* * *

Жыць словам.

* * *

Гукі — закладнікі цішыні.



* * *

Неахвотна старэе сьвятло.

* * *

Дарэмна шукае вецер
сьляды свае на вадзе.

* * *

Хацела б цемра прытулак мець.



* * *

Крыку крык не перакрычаць.

* * *

У ветра ў галаве адліга.

* * *

І ў мудрасьці,
і ў зайздрасьці дарослыя дзеці.



* * *

І памерці самім сабой.

* * *

Чарнавікі жыцьця застаюцца чакаць.

* * *

Ня часта падаюць зоркі
ў студню душы.



* * *

Аголены меч ня мае часу на розум.

* * *

Здрада верная сабе.

* * *

Лоб цьвіка сумуе без малатка.



* * *

Са сьветлай мрояй лацьвей
дасягаецца дно.

* * *

Сьмех перабягае дарогу сьмерці.

* * *

Старасьць — самая надзейная
дарога ў маленства.



* * *

Нуль круглы, як адзінота.

* * *

Нарадзіцца ўсё-ткі
прасьцей, чым памерці.

* * *

Па часе памяць
разьвязвае вузельчыкі.



* * *

Сум сябе суцяшае сам.

* * *

Цесна ў сабе,
а ў сьвеце — няўтульна.

* * *

Клопату заўсёды не стае ўвагі.



* * *

Наступнае наступае
на мазалі мінуламу.

* * *

Душа ў людскім бары
кукуе зязюляй.

* * *

Дарога расьце ўсё жыццё.



* * *

А помнік мусіць расьці.

* * *

Калі ліхтару глядзецца ў люстэрка?

* * *

Доўга жыць даводзіцца доўгу.



* * *

Трызьніць днём безабаронная ноч.

* * *

І ў цемры бачыць сьлед страла.

* * *

Шлях таксама бясконцасьць.



* * *

Дзе навучыцца душы
не спатыкацца?

* * *

Лесу дровы не ў галаве.

* * *

Параненая цішыня ніякавее.



* * *

Ці з заплюшчанымі вачыма
сьпіць сон?

* * *

Зь кім параіцца можа думка?

* * *

Радасьць чуе толькі сябе,
як і маладосьць.



* * *

Доля на долькі ня дзеліцца.

* * *

Крыкі крокаў чуе толькі зьнямога.

* * *

Зоркі з надзеяй трымаюцца
за нашыя позіркі.



* * *

Выходзіш з сябе, а вяртаешся куды?

* * *

Усё не маё акрамя майго.

* * *

І звар'яцець можна захацець.



* * *

Радасьць блізарукая.

* * *

Прыйшоўшы ў сябе,
далёка не адыходзь.

* * *

Чый сын сон?



* * *

Напалоханыя вочы цішыні.

* * *

Зямлю пастом ня зьдзівіш.

* * *

Калі вар'яцее надзея...



* * *

Цемра ўсяісная.
Цемра ўсяісная сама па сабе.

* * *

Страх трывожны, як верабей.

* * *

Маўчыць, як цень.



* * *

Словам можна перавязваць раны.

* * *

Павадырамі бачаць сябе правадыры.

* * *

У ісьціны скептычная ўсьмешка.



* * *

Шлях — той рух, які ня ведаем мы,
а ён нас ведае.

* * *

Час па частках мяне разьбірае,
як гадзіньнік стары.

* * *

Памяць вяртаецца ўзгадаць забытае.



* * *

Дзень заўтрашні ад учарашняга
адстае.

* * *

Улада расьце, як пустазельле.

* * *

І галавешка гарыць,
толькі дыму болей.



* * *

І валатоўкі драбнеюць.

* * *

Вочы чуюць, вушы бачаць.

* * *

Памяць мусіць цяміць.



* * *

Усіх немінуча чакае спадчына —
час.

* * *

Як быццам учора выйшлі з пячоры.

* * *

Цемры ня трэба адзежа.



* * *

Пацьвердзяць і меч, і аловак —
да ўлады
ідуць па галовах.

* * *

Хоць неба яшчэ ўсіхняе.

* * *

Гісторыя не пасьпявае
падбіваць абцасы,
Гісторыкі не пасьпяваюць
цыраваць шкарпэткі.



* * *

Чым зважыць камень,
што ляжыць на сэрцы?

* * *

У віны няма віны.

* * *

Чалавека, як скарб,
хаваюць у зямлю ад жыцьця.


8

* * *

Цемра неназойліва
выдае сваю ўладу.

* * *

Хвароба любіць здароўе.

* * *

Дамавіна ня горбіцца і
пастаяльцам сваім раіць тое ж.



* * *

Самае адкормленае ў сьвеце — зло.

* * *

Шчасьце нязмушана няньчыць бяду.

* * *

Маліцца словам і слову маліцца.


ПОДУМАЙ О ЖИВОМ

* * *

У трывогі пасынак — спакой.

* * *

Глухая старасьць і сябе ня чуе.

* * *

Сьмерць баіцца толькі сябе.



* * *

Цень на жывым
прымервае даўжыню дамавіны.

* * *

Труна адна.

* * *

Цьвік жыве,
покуль б'юць па галаве.


СПАСЕМ
ВСЕ

* * *

А жыць калі?

* * *

На зямлю вяртаемся,
каб разьвітацца.

* * *

Сьмерць ня церпіць канкурэнцыі.



* * *

Цені пацягнуліся да хрусту.

* * *

Ня дужа разгонішся
ў жыцьцёвым загоне.

* * *

І сабе самому не давярае,
таму й калючы вожык.



* * *

Кругагляд у кола зацугляны.

* * *

Вогнішча ахінаецца дымам,
каб сагрэцца.

* * *

Яно і ў здрады, і ў вернасьці
аднолькавыя галасы.



* * *

Я саромеюся чыстага сьнегу.

* * *

Каханьне да заіканьня.

* * *

Калі мы разам, у нас маразм.


ІЛЬІЧ

* * *

І ў салаўя сям'я?

* * *

Ці крыўдна крыўдзе?
Ці крыўдзіцца крыўда?
Ці помніць крыўда пакрыўджанага?

* * *

Ад наканаванкі ўсё жыцьцё ўцякаеш.



* * *

Развадняк-вецер сватае
аўдавелую шыбіну.

* * *

Толькі ў мамы ты лепшы самы.

* * *

Жаданы яд зьмяі-пяшчоты.



* * *

Трымацца за паветра не забаронена.

* * *

Застольле мінус настрой — нікога.

* * *

Жыццё ў часе ці час у жыцці?


роста
десятой
пятилетки.

* * *

Часу няма калі адпачыць.

* * *

Вясло спыняецца ня так, як крыло.

* * *

І ў адпачынка ёсьць цешча — праца.



* * *

Плоціш жыцьцём за жыцьцё,
жывучы на рэшту.

* * *

Гаварлівасьці вучыць вада,
а маўчаньню — зямля.

* * *

Ці зразумеюць іерогліфы
нашых сінічак
на сьнезе ў Кітаі?



* * *

Рацэ ад берага не ўцячы.

* * *

Чалавек задуманы як пытальнік,
а пнецца ў клічнікі.

* * *

А калі б не ўзяць у Адама
тую рабрыну?



* * *

Кожны сам сабе ладзіць труну.

* * *

Сьпіну ня ўмее гнуць хвіліна.

* * *

І да нашай эры жылі намеры.
І да нашай эры былі памеры.



* * *

Шлагбаум як рыбак.

* * *

Сьціпласьць ільнянога палатна.

* * *

У славы смаляныя лавы.



* * *

Жаўрук нашчыцца песьняй.

* * *

Непасрэдны, як абух.

* * *

Пакуль жывеш, зьбіраешся жыць.



* * *

Хмары — неслухі неба.

* * *

І сьцежка дачакалася пашаны.

* * *

А ці ёсьць у Вечнасьці нашчадкі?



* * *

Рэха казыча пяткі рогату.

* * *

Сьлёз хапае на ўсіх у залевы.

* * *

Радзіма там, дзе начуе душа.



* * *

Ветах і маладзік — браты,
а пераглянуцца ня могуць.

* * *

У роднай зямлі і нябожчыку цёпла.

* * *

Пярсьцёнак можа стаць
небасьхілам?



* * *

Каб затрымацца тут, трэба жыць.

* * *

Яблык трымае ісьціну ў кулаку.

* * *

Зьвечарэлая сівізна Беларусі.



* * *

Прывідам страшна
праспаць прыцемкі.

* * *

Гром ня чуе сябе,
бліскавіца ня бачыць.

* * *

Толькі ў мітаў сівізна маладая.



* * *

Позна ўцякаць з сябе,
калі зразумееў свой сум.

* * *

Вада адна, ды студні розныя.

* * *

Сорам у спадчыну не пераходзіць.


МУСОРОСВАЛКА

* * *

Самы беспрытульны ў полі вецер.

* * *

У соннай ракі на шчацэ
радзімка лілеі.

* * *

І сонны туман шукае свае карані.



* * *

Карані — зямлі,
вершаліны — небу.

* * *

Крумкач вячэрае журбой.

* * *

Першы сьнег, як першае каханьне —
вачэе сьвятло ягонае.



* * *

Вечар студзіць гарачую бараду агню.

* * *

На поплаве задумаўся туман.

* * *

Мароз наклікае вясну, сьпёка — зіму.



* * *

Спазьнялася сонца ў госьці да вечара.

* * *

Капыт і падкова сустрэліся выпадкова.

* * *

І ў пеўня два крыла, і ў арла.



* * *

Сэрца ў крыніцы халоднае.

* * *

Каму болей баліць — траве ці касе?

* * *

У расы халодная кроў.



* * *

А мне баліць недабінтаваная бярэзінка.

* * *

Верабей, як коска ў сказе рэчаіснасьці.

* * *

Незабытыя не старэюць.

Словы любяць увагу і клопат пра іх.
Яны ўдзячныя.
А ў вершасказах слова пачувае сябе вальней,
бо не заганяецца дакладна
ў кананічныя ямбы і харэі,
не падганяецца пад абавязковую рыфму.

*Рыгор Барадулін*

Маю надзею, што мае фотаздымкі
дапамогуць чытачу ўбачыць водар слова,
пачуць яго смак.

*Джон Кунстадтэр*

Спачатку было слова.
Слова — вялікая сіла.
Людзі любяць слова.
Адныя за тое, што яго можна не казаць.
Другія за тое, што яго можна ня слухаць.
Трэція ратуюць слова ад першых і другіх.
І слова ратуе іх.
Бо спачатку ўсё ж было слова.

*Алесь Камоцкі*































































































*Літаратурна-мастацкае выданьне*

Барадулін Рыгор Іванавіч

# Навошта

Вершасказы